# Выстаўка польскай кнігі

У памяшканні Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна адкрылася кніжная выстаўка Польскай Народнай Рэспублікі.

Выступаючы на яе адкрыцці, намеснік міністра культуры БССР Р. Г. Мачулін адзначыў растучыя сувязі беларускай і польскай літаратур, кнігаабмен паміж бібліятэкамі Польшчы і Беларусі, які павялічваецца. У рэспубліцы выдадзена звыш 300 розных назваў кніг польскіх аўтараў.

Прысутныя цёпла сустрэлі выступленне дырэктара дэпартамента друку Міністэрства культуры і мастацтва ПНР Алены Заторскай, якая расказала аб развіцці выдавецкай справы ў народнай Польшчы.

Аб мацнеючай дружбе пісьменнікаў Польшчы і Беларусі гаварыў у сваім выступленні пісьменнік Максім Лужанін.

Перарэзаецца стужачка, і наведвальнікі з вялікай цікавасцю знаёмяцца з багацейшай калекцыяй кніг, выпушчаных у Польшчы.

У экспазіцыю ўключана каля 2 тысяч кніг.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічалі намеснік старшыні Беларускага аддзялення Таварыства савецка-поль-

скай дружбы, старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Р. В. Канавалаў, намеснік загадчыка аддзела ЦК КПБ С. В. Марцэлеў, намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. Шамякін.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічаў таксама кіраўнік дэлегацыі Таварыства польска-савецкай дружбы намеснік міністра асветы ПНР Міхал Гадлецкі.

(БЕЛТА).

□